кіраваў Гаўпштэйн. Абодва яны жылі ў Дзвінску, працавалі ў драматычнай дружыне Дзвінскага аддзела і на рэпетыцыі прыязджалі.

*Бальбінава.* У Бальбінаве таксама ў 1942 г. пры Аддзеле беларускага аб'яднання быў утвораны драматычны гурток. Артысты выязджалі на гастролі ў бліжэйшыя мястэчкі і вёскі. Асаблівы водгук у друку знайшоў выезд у Прыдруйск і Друю. Ставіліся п'еса Ф.Аляхновіча "Птушка шчасця", рэжысёрам якой быў Д.Юркевіч, і камедыя М.Чарота "Мікітаў лапаць". Добра igралі І. Блажэніч, І. Дзяргач, А. Пупінь.

*Вільня.* Пры Беларускім камітэце драматург, акцёр і рэжысёр Ф.Аляхновіч арганізаваў тэатральную трупу, якая пачала працаваць ужо з восені 1941 г. у нацыянальным беларускім рэчышчы.

Падводзячы вынікі агляду, нельга не адзначыць той імпэт, з якім ствараліся драматычныя дружыны. Нягледзячы на складаныя ўмовы, народ рабіў намаганні ў развіцці тэатральнай справы. Безумоўна, калектывы дзейнічалі на мястэчковым, раённым узроўні, але і сярод іх сустракаліся прыклады дастаткова высокамастацкай пастаноўкі п'ес і таленавітай ігры акцёраў.

---

1. НАРБ, ф.458, воп.1, спр.79, арк. 3.
2. Там жа, арк. 48.
3. Там жа, арк. 49.
4. Там жа, арк. 61.
5. Там жа, спр. 112, арк. 42.
6. Там жа, арк. 32.

*І.М.Дылянок*

## ДА ВЫЗНАЧЭННЯ ПАНЯЦЦЯ БЫТАВОГА МУЗІЦЫРАВАННЯ

Уся сістэма функцыянавання музычнага мастацтва ў грамадстве складаецца з трох частак: прафесійная музычная творчасць, аматарская музычная самадзейнасць і традыцыйная фальклорная музыка. Бытавое музіцыраванне з’яўляецца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часткай музычнай самадзейнасці. Паводле энцыклапедычнага азначэння, самадзейнае музычнае мастацтва – гэта “аматарская творчасць народных мас у галіне музыкі. Ахоплівае індывідуальнае і калектыўнае выкананне вакальнай і інструментальнай музыкі, а таксама стварэнне музычнах твораў аматарамі” [9, с. 626]. У залежнасці ад умоў бытавання і функцыянальнай накіраванасці самадзейнае музычнае мастацтва падзяляецца на арганізаванае і неарганізаванае – бытавое. Арганізаваная самадзейнасць – гэта аматарская (непрафесійная) творчасць, арыентаваная на сцэнічнае выступленне, якая задавальняе грамадскія і асабістыя патрэбы і інтарэсы. Бытавое музіцыраванне ў адрозненне ад арганізаванай самадзейнасці абмежавана асяроддзем дамашняга быту, разлічана на задавальненне толькі асабістых духоўна-эстэтычных патрэб чалавека.

Да вызначэння паняцця “бытавая музыка” звярталіся такія навукоўцы, як Б.У.Асаф’еў, А.Н.Сохар, Т.А.Шчарбакова, А.С.Яхантава. Б.У.Асаф’еў галоўнымі рысамі пры вызначэнні гэтага паняцця называе агульнадаступнасць, абмежаванне асяроддзем, наяўнасць музычнага інструментарыя. А.Н.Сохар, акрамя агульнадаступнасці, распаўсюджанасці, дэмакратычнасці, адзначае вельмі істотную рысу бытавой музыкі – злітнасць выканання і ўспрымання ў дачыненні да жанраў, якія выконваюцца ў побыце. Т.А.Шчарбакова ў сваім азначэнні дадае такія якасці, як гістарычная, геаграфічная, сацыяльная, нацыянальная дыферэнцыраванасць бытавой музыкі [8, с. 2].

Прааналізаваўшы гэтыя азначэнні, можна зрабіць выснову, што бытавая музыка – гэта агульнадаступная, распаўсюджаная частка масавай музычнай культуры, дыферэнцыраваная геаграфічна, гістарычна, сацыяльна, нацыянальна, абмежаваная дамашнім асяроддзем, для якой характэрна злітнасць выканання і ўспрымання.

Што тычыцца дыферэнцыяцыі паняццяў “музычны побыт”, “бытавая музыка”, “музыка побыту”, то такую спробу зрабіла А. Яхантава. “Музычны побыт – гэта сфера музычнага жыцця грамадства, якая ўключае ўсю сістэму функцыянавання музычных каштоўнасцей” [10, с. 2]. Інакш кажучы, гэта сістэма функцыянавання і прафесійнай, і непрафесійнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музыкі ў розных сацыяльна-бытавых умовах, розных слаях грамадства, мастацка-эстэтычных зонах. “Музыка побыту – гэта музыка прафесійная і непрафесійная, актуальная для канкрэтнага сацыяльнага носьбіта, адрозніваецца ад так званай бытавой музыкі, звязанай толькі з непрафесійнай сферай творчасці” [10, с. 2].

У цяперашні час у тэарэтычным музыказнаўстве застаецца нявызначаным паняцце бытавога музіцыравання.

Тлумачэнне значэння слоў “музіцыраванне”, “музіцыраваць” мы знаходзім у шматлікіх слоўніках. Вялікая савецкая энцыклапедыя так тлумачыць гэтыя паняцці: “Музіцыраванне (ням. musiziren – займацца музыкай) – выкананне музыкі ў дамашнім асяроддзі, па-за канцэртнай залай. У больш шырокім разуменні – увогуле ігра на музычных інструментах” [2, с. 63]. Паводле слоўніка С.Ожагава, “музіцыраваць – значыць іграць на музычным інструменце, займацца музыкай” [5, с. 369]. Такое ж азначэнне даецца Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы [7, с. 179]. У “Новым слоўніку рускай мовы” Т.Ф.Яфрэмавай музіцыраваць – “праводзіць час, іграючы на музычным інструменце, займацца, забаўляцца музыкай” [4, с. 902]. Музіцыраванне тлумачыцца як працэс дзеяння па значэнні дзеяслова *музіцыраваць*. У Тлумачальным слоўніку рускай мовы пад. рэд. Д.Ушакова наступным чынам вызначаецца паняцце “музіцыраваць”: ” ... праводзіць час, іграючы на якім-небудзь інструменце, займаючыся, забаўляючыся музычнай ігрой” [6, с. 275]. Характэрная дэталь: у выданні 1938 г. слова пазначана як устарэлае. Большасць астатніх слоўнікаў даюць такія ці амаль такія азначэнні.

У вышэйпрыведзеных азначэннях пад музіцыраваннем маецца на ўвазе менавіта інструментальнае выканаўства, але, на наш погляд, калі мець на ўвазе бытавое музычнае выканаўства, то правамерна ўключыць сюды і выкананне вакальнай музыкі, таму што музычныя заняткі дома спалучаюць і ігру на інструменце, і спевы песень, рамансаў *a cappella* з інструментальным суправаджэннем. Выканаўца песні, рамнса, нават калі ён не акампаніруе сабе на інструменце, таксама музіцыруе, удзельнічае ў працэсе музычнай творчасці, стварае інтэрпрэтацыю музычнага твора. Тым больш, што ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працэсе дамашняга музіцыравання выкананне інструментальных твораў пастаянна перамяжоўваецца з вакальнымі. Гэта адзіны працэс, і першыя, і другія выконваюць аднолькавыя функцыі – задавальняюць музычна-эстэтычныя запатрабаванні музыканта-аматара. Таму пад бытавым музіцыраваннем мы будзем разумець інструментальнае і вакальнае выканаўства ў дамашнім асяроддзі.

Бытавое музіцыраванне – гэта сфера аматарскай музычнай творчасці, якая займае месца паміж прафесійнай музыкай і традыцыйным фальклорам, з’яўляецца часткай масавай музыкі. Бытавое музіцыраванне мае свае, асаблівыя ўмовы, формы выканання, а таксама функцыі. Перш за ўсё гэта сфера не грамадскіх, а асабістых інтарэсаў асобы. Сацыяльную накіраванасць і апасродкаванасць яно набывае, калі мяняюцца асяроддзе і ўмовы выканання, напрыклад, музыкант пачынае іграць у клубнай самадзейнасці, і вынікам яго творчасці з’яўляецца не хатняе музіцыраванне, а сцэнічнае выступленне, ці заняткі музыкай паступова з’яўляюцца галоўнай сферай дзейнасці музыканта, і ён становіцца прафесійным музыкантам (кампазітарам, аранжыроўшчыкам і інш.). Бытавое музіцыраванне паводле ўмоў выканання – гэта музычнае выканаўства менавіта ў дамашніх умовах у вольны час.

Да формаў бытавога музіцыравання належыць інструментальнае і вакальнае выкананне музычных твораў адпаведных жанраў, якое ў залежнасці ад колькасці выканаўцаў можа быць як сольным (індывідуальным), так і ансамблевым (сямейныя, суседскія, сяброўскія дуэты, трыо і інш.).

Яшчэ адзін фактар, які адрознівае бытавое музіцыраванне ад прафесійнага і фальклорнага выканаўства і адначасова аб’ядноўвае гэтыя музычна-гукавыя прасторы, – гэта рэпертуар, музычная літаратура. У бытавой музыцы прадстаўлены ўзоры і прафесійнай кампазітарскай творчасці (пісьмовай музычнай мовы), і фальклорнай (вуснай) традыцыі. Як слушна заўважае Э. Аляксееў, “... было б неразважліва атаясамліваць пісьмовую музычную мову з творчасцю толькі прафесійных кампазітараў, таксама як вусную мову – з уласна фальклорам. Рэальныя суадносіны больш складаныя” [1, с. 83]. Такім чы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нам, у бытавой музыцы назіраецца музычнае двухмоўе. Э.Аляксееў аналізуе асаблівасці гэтага двухмоўя, апазіцыю паняццяў “самадзейнае – кампазітарскае”, “вуснае – пісьмовае”, а калі шырэй, то “фіксуемае – нефіксуемае” і прыходзіць да высновы, што “... любая з названых пар паняццяў, узятая ізалявана, не стварае строгай апазіцыі” [1, с. 76]. Гэта значыць, што для рэпертуару бытавога музіцыравання характэрна суіснаванне твораў вуснай і пісьмовай традацый, кампазітарскай і самадзейнай музычнай творчасці. Гэтая сфера акумулюе ўзоры ўсіх пластоў музыкі, таму што ў межах бытавой музычнай культуры існуюць розныя, з пункту гледжання мастацка-эстэтычнага ўзроўню, слаі аматараў музыкі, якія маюць адпаведныя ўзроўню і музычным густам запатрабаванні. Трэба адзначыць, што гэтыя запатрабаванні пашыраюцца і павышаюцца ў працэсе заняткаў актыўнымі формамі музычнай дзейнасці. У рэпертуар бытавога музіцыравання ўваходзіць музыка прафесійных кампазітараў (класічная, сучасная акадэмічная), масавая (эстрадная, кінамузыка, музыка самадзейных аўтараў), а таксама фальклорная (інструментальныя найгрышы, народныя песні і інш.).

Існуюць розныя слаі аматараў, удзельнікаў бытавога музіцыравання. Іх можна дыферэнцыраваць па наступных крытэрыях:

– ступені музычнай падрыхтоўкі (тыя, якія маюць прафесійную музычную адукацыю, пачатковую падрыхтоўку ў музычных школах, самавучкі, пачынаючыя музыканты);

– узроўні мастацка-эстэтычных запатрабаванняў, густаў, інтарэсаў;

– прыналежнасці да пэўнага сацыяльнага слоя (інтэлігенцыя, працоўныя, сяляне);

– узроставай прымеце (дзеці, падлеткі, моладзь, дарослыя сярэдняга ўзросту, сталыя людзі).

Кожнай з гэтых груп адпавядаюць свой рэпертуар, узровень выканаўства.

Такім чынам, бытавое музіцыраванне можна вызначыць як частку масавай аматарскай сферы музычнай творчасці (культуры), якая займае месца паміж прафесійнай і фальклорнай музыкай, адрозніваецца ад іх умовамі бытавання і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

функцыянальна, мае асаблівасці функцыянавання ў залежнасці ад сацыяльных, культурна-мастацкіх, матывацыйна-псіхалагічных фактараў. Сацыяльны фактар абумоўлены нацыянальнай, сацыяльнай (да пэўнага слоя грамадства) прыналежнасцю асобы, узроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця пэўнага грамадства. Пад культурна-мастацкім фактарам маюцца на ўвазе агульнакультурнае развіццё грамадства і ўзровень менавіта музычнай культуры, жанрава-стылявых напрамкаў масавай музыкі, пэўнай моды і інш. Матывацыйна-псіхалагічны фактар тлумачыцца тымі псіхалагічнымі ўстаноўкамі, дзякуючы якім чалавек займаецца музычнай творчасцю, тымі функцыямі, якія выконвае бытавое музіцыраванне.

---

1. *Алексеев Э.Е.* Фольклор в контексте современной культуры: Рассуждения о судьбах народной песни / ВНИИ искусствознания. – М.: Сов. композитор, 1988. – 236 с.

2. *Большая* советская энциклопедия: [В 30 т.] / Гл. ред. А.М. Прохоров. – 3-е изд. – М.: Сов. энциклопедия, 1974. – Т. 17: Моршин – Никиш. – 616 с.

3. *Глебов И.* Музыка города и деревни // Музыка и Октябрь. – 1926. – № 3. – С. 6–8.

4. *Ефремова Т.Ф.* Новый словарь русского языка. Толково-словообразовательный. – М.: Рус. яз., 2000. – Т. 1: А – О. – 1209 с.

5. *Ожегов С.И., Шведова Н.Ю.* Толковый словарь русского языка: 80000 слов и фразеологических выражений / РАН. Институт русского языка им. В.В. Виноградова. – 4-е изд., доп. – М.: Азбуковник, 1998. – 944 с.

6. *Толковый* словарь русского языка: [В 4 т. / Сост.: В.В.Виноградов и др.]; Под ред. Д.Н. Ушакова. – М.: АО “Рус. словарь”, 1994. – Т. 2: Л – О. – 1040 стб.

7. *Тлумачальны* слоўнік беларускай мовы: У 5 т. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа; [Пад агул. рэд. К.К.Атраховіча (К. Крапівы)]. – Мн.: Гал. рэд. Бел. сав. энцыклапедыі. – Т. 3: Л – П. – 1979. – 672 с.

8. *Щербакова Т.А.* Музыка быта и русская профессиональная музыкальная культура XIX века: Автореф. дис. … д-ра искусствоведения: (17.00.02) / ВНИИ искусствознания. –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

М., 1989. – 48 с.
9. *Энцыклапедыя* літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. / Рэдкал: І.П.Шамякін і інш. – Мн.: БелСЭ, 1986. – Т. 1: Акапела – Габелен. – 724 с.
10. *Яхонтова Е.С.* Музыкальный быт современного русского села: (На материале одной локальной традиции Поволжья): Автореф. дис. … канд. искусствоведения: (17.00.02; 09.00.09). – Л., 1985. – 21 с.

*П.Н.Епіхаў*

## ФЕНОМЕН ПАЛЕССЯ Ў КАНТЭКСЦЕ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

Беларусь падзяляецца на шэсць гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў. Два з іх адносяцца да Палесся: Заходняе Палессе і Усходняе Палессе. Самыя старажытныя ўспаміны пра Палессе адносяцца да XIII ст., менавіта да 1276 г. Пад гэтай датай аўтар "Іпацьеўскага летапісу" адзначыў, што луцкі князь Мсціслаў Даніловіч вёў ваенны паход ад Капыля па Палессі. Лічыцца, што слова "палессе" паходзіць ад слова "лес" і азначае "край, што ляжыць пад вялікімі лясамі" [4, с. 20]. Праз яго праходзілі гандлёвыя шляхі з поўначы на поўдзень і з захаду на ўсход. Да канца 50-х гг. XX ст. Палессе было самым вялікім у Еўропе краем дрыгвы, лясоў, азёр і рэк. Яго лічылі мясцінай, якая была не толькі недаступнай, але нават і варожай чалавеку. Можна сказаць, што Палессе – гэта край, поўны таямніц, які знаходзіцца ў цэнтры Еўропы. Гэты рэгіён і па сённяшні дзень тоіць шмат загадак. Тэрыторыя Палесся адносна адміністрацыйна-палітычнага дзялення краіны ахоплівае Брэсцкую, Гомельскую і паўднёвую частку Мінскай абласцей. Па плошчы Палессе займае амаль палову тэрыторыі Беларусі. Галоўнай ракой Палесся з'яўляецца Прыпяць з прытокамі Стыр, Тура, Гарынь, Убарць, Піна, Ствіга, Ясельда і інш.

На Палессі са старажытных часоў пражывалі славянскія плямёны. Гэтая акалічнасць з'явілася прычынай даволі працяглага па часе захавання архаічных рыс у культуры і побы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ